**Жалезная Надзея**

## Дзядулю прысвячаю….

*Памяці Івана Карповіча*
*з агр. Даматканавічы і тых,*
*каго вывозілі на прымусовыя*
*работы ў Германію.*

Першага мая людзі спявалі,

Свята вясны ўсей вёскай гулялі.

І помніцца мне, плача матуля:

“Дзеткі мае, памірае дзядуля!”

Больш не сустрэў ён  Дня Перамогі,

Так падвялі яго хворыя ногі,

Што некалі землю фашыстаў тапталі-

Ворагі ўсіх пад прымусам забралі.

Хварэлі ў бараках, цярпелі прыгнёт.

Бясконцым  здаваўся вайны калаўрот.

“Запомніце дзеці! – сказала матуля, —

За мірнае неба змагаўся дзядуля!”